10 цікавых фактаў з жыцця старэйшага святара Беларусі

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
25.09.2016 00:00



90-гадовы кс. прэлат Юзаф Трубовіч рыхтуецца адзначыць 60-годдзе прэзбітэрскіх пасвячэнняў. З іх 35 гадоў святар аддана служыць Касцёлу на Гродзеншчыне. З 1977 г. на працягу 11-ці гадоў працаваў у францішканскім касцёле. У 1992–1998 гг. – у катэдры. У той жа час рэгулярна наведваў вязняў у гродзенскай турме. У канцы 1998 г. быў пробашчам у Каменцы. З 1999 г. па сённяшні дзень выконвае святарскія абавязкі ў парафіі Гродна-Паўднёвы. **А ці ведалі Вы, што кс. Юзаф Трубовіч валодае 9-цю мовамі? А тое, што ён 7 гадоў спаў на дошцы са скрынкай з фанеры пад галавой? Спецыяльна для “Слова Жыцця” святар распавядае некаторыя цікавосткі са свайго жыцця.**

1. Залічаны адразу на 2-гі курс семінарыі

Для паступлення ў Рыжскую духоўную семінарыю неабходна было скончыць сярэднюю школу. Я спрабаваў туды паступіць штогод, пачынаючы з 9-га класа. А калі скончыў 12 класаў, семінарыю закрылі. Каб не марнаваць часу, я пачаў працаваць у Рызе на фабрыцы серыйнага будаўніцтва шматкватэрных дамоў, затым паступіў у радыётэхнічны тэхнікум. Неўзабаве аднавіла дзейнасць семінарыя. Я зноў спрабаваў залічыцца, на што рэктар параіў спачатку скончыць тэхнікум. Я адказаў: “Баюся, семінарыю зноў зачыняць”. У красавіку 1952 г. мяне прынялі на вучобу адразу на 2-гі курс. Быў вельмі шчаслівы! Семінарыйная фармацыя дала мне асновы і правілы аскетычнага жыцця, пазнанне навукі Езуса Хрыста, якую абвяшчае Касцёл, ацэнку праўды ў параўнанні з іншымі канфесіямі, сектамі і свецкімі ісцінамі, а таксама разуменне Божай праўды “Я ёсць, каторы ёсць”. †

2. Каля 20-ці гадоў служыў у Латвіі

У 1956 г. я скончыў семінарыю і ўжо праз 14 дзён пасля прыняцця святарскага пасвячэння быў неадкладна пасланы ў парафію ў Ліепаю на балтыйскім узбярэжжы Латвіі. На працягу 6-ці гадоў працаваў там разам з генеральным вікарыем кс. Юльянам Вайводсам. Адтуль быў пераведзены ў парафію Курменэ. Там і яшчэ на двух прылеглых пляцоўках служыў на працягу 14-ці гадоў. Дарэчы, у Латвіі католікі складаюць палову жыхароў краіны. Рэшта – лютэране, праваслаўныя і сектанты, пераважна баптысты. Вернікі асаблівым чынам ушаноўваюць Найсвяцейшую Маці, таму гэтую краіну называюць яшчэ “Зямлёй Марыі”. У Аглоне ёсць базіліка, дзе знаходзіцца цудатворны абраз Маці Божай. У 1995 г. латвійскі парламент прыняў пастанаўленне “Аб санктуарыі міжнароднага значэння ў Аглоне”. Штогадова ў жніўні туды прыбываюць пілігрымы з розных мясцін Латвіі і ўсяго свету.

3. Працаваў прэфектам семінарыі ў Рызе

У 1988 г. кс. кардынал Юліян Вайводс, які быў маім першым пробашчам непасрэдна пасля пасвячэння, прызначыў мяне на пасаду прэфекта (першапачаткова гэта функцыя называлася “інспектар”) Рыжскай вышэйшай духоўнай семінарыі, дзе я працаваў амаль 4 гады. Нягледзячы на тое, што працы было шмат, выконваць гэтыя абавязкі мне вельмі падабалася. З вялікім задавальненнем і радасцю мы прымалі кандыдатаў. Яны былі вельмі стараннымі, паколькі трапіць у семінарыю тады было складана. За час маёй паслугі прэфекта ў семінарыі пасвячэнні там прынялі каля 20-ці хлопцаў з Беларусі. Хрыстовы Касцёл абапіраецца на святароў, якіх я называю “чорныя мурашкі”. У нас ёсць Святы Айцец – галава Касцёла, ёсць біскупы, якія кіруюць мясцовым Касцёлам. Але калі б не было святароў, каго б тады ўзначальвалі і кім кіравалі? Нездарма сам Езус пабуджае верны люд прасіць Нябеснага Айца, каб паслаў работнікаў на вялікае жніво.



4. Асаблівым чынам шануе Маці Божую

Найсвяцейшая Маці нястомна дапамагае сваім дзецям. Я заклікаю Яе з 1954 г., калі ў семінарыі трапіў на Навэнну да Маці Божай Нястомнай Дапамогі. “О, мая Пані, мая Маці, памятай, што я Твой. Ахоўвай мяне і барані як сваю рэч і ўласнасць”. Вялікай падтрымкай з’яўляецца для мяне і Вязень Любові ў табернаклі, аб якім я ніколі не забываюся. І Найсвяцейшая Тройца, якая па-асабліваму прысутнічае ў парафіяльным касцёле ў маёй роднай мясцовасці ў Плюсах (знаходзіцца на адлегласці 250 км ад Рыгі і 480 км ад

Гродна, Віцебская вобласць – заўв. рэд.).

5. Вёў аскетычнае жыццё

Яшчэ будучы вікарыем, а потым і пробашчам, на працягу 13-ці гадоў я спрабаваў не есці мяса. 7 гадоў спаў на дошцы з фанернай скрынкай пад галавой, у якую ўклаў рэліквіі св. Францішка з Асізі. З 1956 па 1991 г. свядома спаў толькі 6 гадзін у суткі замест патрэбных 8-мі. Такім чынам я зэканоміў 3 гады 75 дзён. Не ведаю толькі, як гэта паўплывала на здароўе... У выніку дадаў да свайго жыцця 7 гадоў: на 4 гады скараціўшы час навучання і на 3 – час сну.

6. Напісаў дзве кнігі

Назіраючы за жыццём чалавека, які губляе паняцце аб сваёй мэце, я напісаў першую кнігу пад назвай “Дарога звычайнага жыцця”. Гэта своеасаблівы род маёй біяграфіі. Другую кнігу напісаў, бо сёння чалавек і свет вельмі часта адыходзяць ад праўды. Нават не шукаюць яе. А гэта ж Бог з’яўляецца Праўдай! Адсюль мая другая кніга – “Чаму аб праўдзе і рэчаіснасці”. Збіраўся напісаць яшчэ адну, але пакуль што гэтаму не спрыяюць абставіны.

7. Ведае шмат моў

Раней я вывучаў некаторыя замежныя мовы: нямецкую, англійскую і французскую. Але калі зразумеў, што нідзе іх не выкарыстаю (паколькі за мяжу не выпускалі), закінуў усё гэта. Пры мне засталіся толькі польская, руская, беларуская, латвійская, літоўская, часткова лацінская і англійская. У вечнасці, хіба, і гэтыя не спатрэбяцца. Будзе агульная мова зразумення.

10 цікавых фактаў з жыцця старэйшага святара Беларусі

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
25.09.2016 00:00

